ISSN 1991-3850

GS. BY gazeta.slonimskaya gazslonim gazetaslonimskaya gazeta_slonimskaya GazetaSlonim

Газета Слонімская

Агульнапалітычны штотыднёвік Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе. КОШТ СВАБОДНЫ

№9 (1134)
27 лютага 2019 года



СЕЛФИ номера

Девочка потерялась по дороге в школу

ЕЁ НАШЛИ МИЛИЦИОНЕРЫ

В понедельник, 25 февраля, сотрудники Слонимского отдела департамента охраны Александр Гурский и Александр Гудков нашли семилетнюю Надю, которая не доехала до школы.

Девочка плакала на остановке общественного транспорта: она заблудилась и не смогла самостоятельно добраться до школы.

Сотрудники охраны убедились, что ребенку ничего не угрожает, и передали Надю сотрудникам инспекции по делам несовершеннолетних Слонимского райисполкома.

Ольга ШИНКЕВИЧ
ФОТО СЛОНИМСКОГО ОТДЕЛА ДЕПАРТАМЕНТА ОХРАНЫ

Александр Гудков и Александр Гурский нашли семилетнюю Надю

Больше материалов и фото смотрите на нашем сайте WWW.GS.BY

ОПРОС

ГДЕ В СЛОНИМЕ НЕ ХВАТАЕТ ЗЕЛЁНЫХ НАСАЖДЕНИЙ?

Валерий:

— Мне кажется, везде не хватает деревьев. На мой взгляд, вдоль дороги должны расти деревья. В этом плане показателен берлинский бульвар Унтер-ден-Линден, который получил своё название благодаря растущим вдоль него липам и который очень красиво смотрится. Мне кажется, что везде в черте города нужно посадить деревья. А если сажать, то нужно использовать клён, тополь. Вот клумб в городе хватает.

Илья:

— Мне кажется, что везде всего хватает. В городе достаточно деревьев и клумб. Особенно много в городе клумб, и они все такие необычные, я бы даже сказал, оригинальные. Хотя всё-таки каких-то хвойных вечнозеленых деревьев — елей, пихт, туй — в городе не хватает.

Больше материалов и фото смотрите на нашем сайте WWW.GS.BY

Екатерина:



— Наверное, в центре маловато зелёных насаждений. Хотелось, чтобы росли деревья вдоль дороги.

Мария:

— На центральной площади возле райисполкома не хватает зелени. Хотя сама площадь выглядит красиво и уютно, но недостает там деревьев, особенно летом. Когда жарко и душно, хочется ведь спрятаться в тенёк. Тем более молодёжь любит на площади летом проводить время, и там всегда много народу, когда тепло.

Даниил:

— В принципе, в городе хватает деревьев. Озеленение в Слониме хорошее, на мой взгляд. Только вот я заметил, что в городе очень мало растет дубов. В основном посажены липы, березы, каштаны, а дубов практически нет.

Кристина СОЛОДУХО
ФОТО АВТОРА

АЛЛО, МЫ СЛУШАЕМ ВАС

Уважаемые читатели, если вам есть что рассказать, если вы стали участником интересной истории или свидетелем важного для города события, необычного происшествия, напишите нам: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, mail: anna@gs.by или сообщите по тел. 8 01562 29-000,
8 029 612-26-43, 8 044 560-70-54

РУКОВОДИТЕЛИ ПРОВЕДУТ ПРЯМЫЕ СУББОТНИЕ ЛИНИИ

Геннадий Хомич

Слонимский райисполком

Владимир Кравцов

Председатель Слонимского райисполкома Геннадий Хомич проведет в субботу, 2 марта, прямую телефонную линию.

Согласно информации сайта райисполкома, позвонить Геннадию Болеславовичу можно с 9 до 12 часов на номер 8 (015 62) 5-03-11.

Одновременно в Слонимском районе председатели сельсполкомов каждую субботу с 9 до 12 часов проводят прямые телефонные линии с населением.

2 марта прямую линию согласно графику проведет председатель Гродненского облисполкома Владимир Кравцов. Владимир Васильевич будет дежурить на линии 8 (0152) 73-56-44 с 9 до 12 часов.

Жанна ИВАНОВА

ЯК ЁСЦЬ

STOP прапагандзе палення ў Слоніме!

«Спыніце масавую прапаганду палення ў Слоніме, прыбярыце тытунёвыя кіёскі «Табакерка» і «Табак» — пад такім зваротам да ўладаў падпісаліся больш як 250 жыхароў Слоніма.

У пятніцу, 22 лютага, слонімскі грамадскі актывіст Алесь Масюк адаслаў гэты зварот слонімцаў у Адміністрацыю прэзідэнта Беларусі, Гродзенскі аблвыканкам, Слонімскія райвыканкам і раённы Савет дэпутатаў.

«Гандлёвыя аб`екты «Табакерка» ўстанаўліваюць на прыпынках грамадскага транспарту, паблізу школ, дзіцячых садоў, установаў гандлю і аховы здароўя... Падобная практыка рэалізацыі тытунёвай прадукцыі дыскрэдытуе ідэю здаровага ладу жыцця... Зводзіць на нішто правядзенне ва ўстановах адукацыі прафілактычных мерапрыемстваў і акцый супраць палення. А таксама цалкам супярэчыць дзяржаўнай праграме «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2016-2020 гады», — напісалі сярод іншага ў сваім звароце да ўладаў слонімцы.

«Патрабуем прыбраць з тэрыторыі горада Слоніма тытунёвыя кіёскі «Табакерка» і «Табак», — пішуць ініцыятары ў канцы свайго звароту да ўладаў жыхары горада.

Паводле Алеся Масюка, у Слоніме ўжо ўсталявалі больш за 10 шапікаў для продажу тытунёвай прадукцыі і ідзе набор прадаўцоў у гэтыя гандлёвыя кропкі.

— Звярнуцца да ўладаў з гэтым зваротам было ініцыятывай сяброў грамадскага аб`яднання «МІНОЛС», у тым ліку і мяне. Але подпісы збіралі не толькі сябры ГА «МІНОЛС», але і іншыя неабыякавыя да гэтай праблемы слонімцы. Хачу адзначыць, што жыхары горада ахвотна ставілі подпісы пад гэтым зваротам. Недзе 95% тых, да каго звярталіся актывісты, паставілі свае подпісы пад зваротам. Падпісваліся і тыя, хто сам паліць тытунь. Людзі разумеюць, што такое масавае размяшчэнне ў людных месцах горада шапікаў з тытунём найперш будзе правакаваць да палення моладзь. Таму так ахвотна падпісваліся. Лісты я накіраваў адрасатам. Цяпер пачакаем, што адкажуць улады, — адзначыў у размове з карэспандэнтам «ГС» Алесь Масюк.

— Мяне непакоіць, што дэпутаты райсавета маўчаць, ніяк не выказваюць свае адносіны да гэтых «Табакерак», хоць у раённым Савеце дэпутатаў ёсць адмысловая камісія, якая займаецца пытаннямі аховы здароўя. Дэпутаты-педагогі маўчаць, дэпутаты-медыкі маўчаць, усе маўчаць, — дадаў напрыканцы размовы грамадскі актывіст.

Мікола КАНАНОВІЧ
ФОТА З АРХІВА АЛЕСЯ МАСЮКА

«Табакерка» на прыпынку «Спадарожнік»

ФОТА ЯЎГЕНА ВАЛАДАШЧУКА

На Энцы невядомыя атакавалі «Табакерку», 25.02.2019

9 домов в Слониме могут включить в реестр пустующих

ПРОСЯТ ОТОЗВАТЬСЯ СОБСТВЕННИКОВ ИЛИ НАСЛЕДНИКОВ

На сайте Слонимского райисполкома 9 февраля был обнародован перечень домов, подлежащих включению в реестр пустующих домов по Слонимскому району.

Этот дом по ул. Коссовский тракт, 16 может оказаться в реестре пустующих

Это дома, находящиеся в Слониме по следующим адресам: ул. 17 Сентября, д. 10, ул. Войкова, д. 5, ул. Железнодорожная, д. 26, ул. Ружанская, д. 35, пер. Шоссейный, д. 6, ул. Коссовский тракт, д. 30, ул. Коссовский тракт, д. 16, ул. Сельская, д. 7, ул. Сельская, д. 8.

В связи с этим Слонимский райисполком предлагает собственникам, в том числе наследникам, принявшим наследство, но не оформившим прав на жилой дом (другим заинтересованным лицам) в течение одного месяца с момента опубликования сведений о пустующих жилых домах, подлежащих включению в реестр пустующих домов по Слонимскому району, уведомить Слонимский райисполком о намерении использовать пустующий дом для проживания, с приложением подтверждающих документов.

Обращаться нужно в райисполком в каб. 528, тел. для справок 5-05-67. Если уведомление в течение указанного срока не будет предоставлено, это будет расценено как отказ от права собственности на жилой дом.

Такие дома будут включены в реестр пустующих.

Сейчас в реестре, размещенном на сайте райисполкома, насчитывается 102 пустующих дома.

Жанна ИВАНОВА

«Мы хочам жыць як людзі!» —

Пункт паштовай сувязі ў аграгарадку Вострава Слонімскага раёна і пасля 1 сакавіка будзе працаваць так, як і раней.

Вяскоўцы на сходзе, 21.02.2019

У лісце ў Слонімскі райвыканкам 115 вяскоўцаў падпісаліся за захаванне ў аграгарадку Вострава пункта паштовай сувязі, які мясцовыя ўлады і кіраўніцтва раённага вузла сувязі планавалі закрыць сёлета з 1 сакавіка.

Сход жыхароў Вострава і навакольных вёсак з прадстаўнікамі ўлады па пытанні паштовага абслугоўвання ў аграгарадку прайшоў 21 лютага.

Людзей сабралася столькі, што ў вясковым клубе не хапіла месцаў для ўсіх прысутных, і прыйшлося прыносіць крэслы і кушэткі з суседняй бібліятэкі.

Сход пачала начальнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама Наталля Юнчыц, якая хутка перадала слова начальніку раённага вузла сувязі Валерыю Савіцкаму.

— Пошта працуе сёння і будзе працаваць заўтра. Але пошта — такая арганізацыя, якая павінна паслугі аказваць і на сябе зарабляць, — пачаў сваё выступленне спадар Савіцкі. — А цяпер я прывяду вам некаторыя лічбы з працы паштовага пункта ў Вострава за студзень гэтага года. Арыфметыка такая: паштовак вы купілі 9 штук, канвертаў — 4 штукі, адправілі 1 пасылку, правялі 615 плацяжоў па АРІП. У сярэднім выходзіць, што на пошту прыйшло 125 чалавек. Сярэдняя наведвальнасць пошты атрымліваецца 5-7 чалавек у дзень. Глядзім далей. На сённяшні дзень вы выпісваеце 28 рэспубліканскіх газет, іншыя дробныя выданні я не бяру пад увагу. У Вострава ваш паштальён і аператар паштовай сувязі Ірына Мар`янаўна абслугоўвае 107 двароў, а таксама яшчэ вёскі Смаўжы, Засімавічы, Старую і Новую Пераваlокі, усяго кожны працоўны дзень ёй патрэбна абысці 7,5 кіламетраў. Акрамя гэтага, з 5-га да 25-га дня кожнага месяца па графіку адбываецца выдача 94 пенсій. У сярэднім атрымліваецца па 5 пенсій у дзень. Такая сітуацыя ў лічбах на сённяшні дзень. Для пошты яна катастрафічная. Патрэбна альбо на старане недзе зарабляць, альбо скарачаць тут чалавека і арганізоўваць паштовае абслугоўванне праз перасоўны аўтамабільны пункт паштовай сувязі, альбо навучыць аднаго з прадаўцоў у мясцовай краме, каб вы там маглі карыстацца паштовымі паслугамі, праводзіць плацяжы, а мы будзем даплачваць ёй за сумяшчальніцтва.

Далей паштовы кіраўнік прапанаваў вяскоўцам паспрабаваць паралельна з працай асноўнага стацыянарнага пункта паштовай сувязі пакарыстацца ў сакавіку і паслугамі аўтамабільнай пошты.

— У Кастровічах, Хадзявічах, Харашэвічах і іншых вёсках раёна даўно ўжо працуе перасоўны паштовы пункт сувязі, — адзначыў у сваім выступленні Валерый Савіцкі.

Аднак ніводзін з прапанаваных варыянтаў жыхароў аграгарадка не задаволіў.

— Ніякіх машын! Навошта нам ваша машына! Ніхто не будзе лавіць тую машыну! Мы настойваем, каб пошта засталася... — эмацыянальна выказваліся вострвўцы.

Тым часам праз паўгадзіны пасля пачатку сходу ў Вострава прыехаў старшыня Слонімскага раённага Савета дэпутатаў Алег Таргонскі.

ШТО НАБУДЗЕ І ШТО СТРАЦІЦЬ СЛОНІМ З

Сёлета 31 жніўня — 1 верасня Слонім стане пляцоўкай святкавання рэспубліканскага свята — Дня беларускага пісьменства. СМІ стракацяць загалоўкамі кшталту тых, што горад актыўна рыхтуецца да гэтай падзеі. Слонімцы таксама ўжо заўважылі нейкія захады па падрыхтоўцы да свята. Так, выбраны макет доўгачаканага помніка Льву Сапегу. На дамах з`явіліся шыльды з назвамі вуліц (праўда, чамусьці на рускай мове). З канца мінулага года сталі рамантаваць балконы дамоў на цэнтральнай Чырвонаармейскай вуліцы. Жыхарам горада прапанавалі выбраць слоган свята. У скверы і на вакзале з`явіліся інфармацыйныя стэнды, якія дазваляюць турыстам зарыентавацца ў горадзе. Арганізатары агучылі прыкладны план святкавання, а таксама выдаткі на яго. Пры гэтым многія слонімцы не хочуць заставацца ўбаку ад важнай падзеі, якая чакае іх горад, і выказваюцца пра падрыхтоўку да свята і мэтазгоднасць расходавання выдзеленых на яго сродкаў.

Ці паспеюць?

На мінулым тыдні ў рэдакцыю «ГС» патэлефанаваў слонімец, які назваўся Вадзімам, і выказаўся наконт таго, як наш горад рыхтуецца да свята рэспубліканскага маштабу —

Турыстычны стэнд у цэнтры горада

Дня пісьменства. На яго думку, падрыхтоўку да свята трэба ўжо даўно распачынаць.

— Прачытаў матэрыял у газеце «Якім можа быць канал Агінскага ў Слоніме». І якім ён можа быць?! Пішаце, што будуць добраўпарадкаваныя прылеглыя да набярэжнай вуліцы. А іншыя? Калі ад прыстані ісці да Баранавіцкага моста, дык там суцэльныя зараснікі. Планавалі ж там рабіць пешаходную і веласіпедную дарожкі. А чаму цяпер, калі дазваляла надвор`е, не высекчы хаця б тое кустоў? Ды і наогул каля канала пасярод кустоў уладкавалі звалку, дзе выкідваюць смецце. Я іду на працу праз пешаходны мост і гэтаназіраю. І нікому да гэтага няма справы.

Я спрабаваў падняць гэтую праблему, пазваніўшы кіраўніцтву райвыканкама на прамую тэлефонную лінію. Усё абяцаюць, што будуць выпраўляць.

А ці паспеюць усё зрабіць да свята? Верыцца ў гэта з цяжкасцю. Трэба ўжо пачынаць нейкія будаўнічыя працы, тым больш што надвор`е гэтаму спрыяе.

Іванава, дзе летась праводзілі Дзень пісьменства, рыхтаваўся да свята два гады. І за гэты час сапраўды змаглі добраўпарадкаваць горад так, што ён набыў свае адметнасці. А што ў нас паспеюць зрабіць, лічы, за тры месяцы?! — з сумневам пытаўся субяседнік.

Чым слонімцы будуць здзіўляць гасцей

Тым не менш у Іванава, прыняўшы эстафету Дня пісьменства, старшыня райвыканкама Генадзь Хоміч запэўніў, што слонімскія ўлады пастараюцца да свята добраўпарадкаваць цэнтральную частку горада, а таксама набярэжную канала Агінскага.

Як пазней стала вядома «ГС», добраўпарадкаванне набярэжнай да Баранавіцкага моста не плануецца. За бюджэтныя сродкі каля канала павінны пакласці асфальт да пешаходнага масціка і адрамантаваць гэты самы масцік. На сродкі ГА «Канал АгінскагаСлонім» канал пачысціл.

Арганізатары абяцаюць, што свята ў Слоніме стане ўнікальным і гасцей слонімцы здзівяць не адной ізюмінкай. Так, будзе прыдуманы талісман свята, тры будынкі — на вул. Чырвонаармейскай, 23 і 17, пр. Незалежнасці, 27 — будуць упрыгожаны тэматычнымі графіці, пройдзе гастрафэст, на якім госці будуць мець магчымасць пакаштаваць стравы, апісаныя ў кнігах класікаў беларускай літаратуры.

Занятак і забавы па душы госці і ўдзельнікі свята змогуць знайсці на 15 пляцоўках, якія разгорнуцца ў розных месцах горада (у тым ліку ў Жыровічах) — сярэднявечнай, фальклорнай, турыстычнай, кніжнай, дзіцячай, фестывальнай, спартыўнай і іншых. (Магчыма, галоўная творчая пляцоўка ўпершыню размесціцца не на цэнтральнай гарадской плошчы каля райвыканкама, як планавалася спачатку, а паміж цэнтрам культуры і каналам Агінскага.)

У сакавіку ў свята з`явіцца свой акаўнт у сацсетках, летам тэматычныя рубрыкі будуць весціся і на рэспубліканскіх тэлеканалах. Такая шырокая рэклама, як мяркуюць арганізатары, прыцягне ў Слонім больш турыстаў.

Цяпер пераважна рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя, і зусім хутка пачнуцца маштабныя рамонтныя працы. Усе яны будуць завершаны ў тэрмін, абяцаюць арганізатары.

Што адрамантуюць

У Слоніме да часу Х будзе адрамантаваны шэраг аб`ектаў, у тым ліку жылыя дамы і вуліцы.

Рамонт чакае гасцініцу «Шчара». У сувязі з правядзеннем рэканструкцыі гасцініца закрылася з 25 лютага да 30 жніўня. Кафэ «Шчара» прыпыніць сваю працу з 4 сакавіка. Як мяркуецца, нумароў у гасцініцы стане менш, пры гэтым будзе павышана іх камфортнасць.

вяскоўцы адстойваюць свае правы

Вось яна якая, пошта мабільная

— На сённяшні дзень пытанне канчаткова не вырашана па закрыцці аддзялення. Як вы вырашыце з поштай, так і будзе: хочаце, каб застаўся пункт сувязі ў аграгарадку, значыць, застанецца. Але я за тое, каб у сакавіку паштовая машына да вас усё ж пахадзіла, — выказаўся па галоўным пытанні сходу старшыня райсавета і прапанаваў абмеркаваць і іншыя пытанні, якія хвалююць вяскоўцаў. «Мы хочам жыць як людзі», — казалі прысутныя вяскоўцы.

Апроч таго, высветлілася, што людзей не задавальняе графік падвозу газавых балонаў два разы на месяц, не задавальняе стан дарог, якія дарожныя службы дрэнна абслугоўваюць, а 50 (на момант сходу) сяброў кааператыва па праваздзенні ў Вострава прыроднага газу цікавіліся, ці пачнуць у гэтым годзе газавікі цягнуць да іх газавую трубу.

— Газ — гэта добра. Але і печкі з хат не выкідайце, калі газ праведзяце. Час цяпер такі, што нам прыйдзецца плаціць па поўнай і за газ, і за электраэнергію, — сказаў Алег Таргонскі з нагоды пракладкі газаправода, але прызнаўся, што не валодае інфармацыяй, каб нешта канкрэтнае сказаць па тэрмінах рэалізацыі гэтага праекта.

Далей старшыня райсавета паабяцаў пасадзейнічаць, каб дарожнікі часцей чысцілі мясцовыя дарогі, тут жа звязаўся па мабільнай сувязі з дырэктарам ВА «Слонімгаз» і запытаў, ці могуць яны прывезці ў вёску балон па-за графікам, каб не чакаць два тыдні, ці магчыма ўсталяваць другі балон на кухні альбо двухбалонную скрыню для газу на вуліцы, калі чалавек яе купіць, на што той адказаў, што ўсё гэта цалкам магчыма і яны ў такіх выпадках ідуць насустрач людзям.

— Бандыты забралі ў нас у арэнду два возеры — у Смаўжах і Вялікі млын. Цяпер там ні рыбу палавіць, ні пакупацца, ні пазагараць. Алег Мечыслававіч, просім пасадзейнічаць, каб пачысцілі нам возера ў Старой Паравалоцы, якое апошні раз меліяратары чысцілі гадоў 12 назад і пачысцілі дрэнна, — выказаў просьбу землякоў мясцовы механізатар Пётр Варона.

— З арандатарамі патрэбна разбірацца, калі палку перагібаюць. Але гаспадар у вадаёма сёння павінен быць, — адказаў на тое старшыня раённага Савета дэпутатаў.

На развітанне Алег Таргонскі павіншаваў мужчын з Днём абаронцаў Айчыны ды пажадаў, каб не прыйшлося абараняць сваіх родных, блізкіх і сваю зямлю са зброяй у руках. Жанчын старшыня павіншаваў з хуткім жаночым святам ды паабяцаў у хуткім часе прыехаць папарыцца ў мясцовай лазні, якую ўлады летась адкрылі пасля закрыцця праз два месяцы па патрабаванні мясцовых жыхароў.

Пасля сходу ў гутарцы з карэспандэнтам «ГС» былы намеснік старшыні колішняга калгаса «Рассвет» Мікалай Трафімовіч параўнаў мінулае роднай вёскі і сучаснасць.

— Раней мы кожны год нешта прыбудоўвалі і адкрывалі. Цяпер кожны год нешта закрываюць. Раней мы жылі і развіваліся, а цяпер дажываем... А хаты пустыя ў старым Востраве ўжо на дровы рэжуць, — выказаўся Мікалай Ігнатавіч.

Мікола КАНАНОВІЧ
ФОТА АЎТАРА
БОЛЬШ ФОТА І ВІДЭА ГЛЯДЗІЦЕ НА САЙЦЕ GS.BY

Выступае начальнік ідэалагічнага аддзела Наталля Юнчыц

НАГОДЫ СВЯТКАВАННЯ ДНЯ ПІСЬМЕНСТВА

Будуць капітальна адрамантаваны Слонімскі краязнаўчы музей і цэнтральная бібліятэка (адрамантаваны фасады, заменены дах, вокны і ўваходная група). На час рамонту апошняя можа пераехаць у пусты будынак зачыненай з 1 верасня бібліятэкі №1 (дзіцячая бібліятэка там застаецца), а пасля вяртання ў абноўлены будынак у былой бібліятэцы можа размясціцца выставачная зала краязнаўчага музея і фондасховішча.

Акрамя гэтага, да свята будзе ўсталяваны помнік слонімскаму старасту Льву Сапегу, выраблены (на спонсарскія сродкі) помнік гетману Міхаілу Казіміру Агінскаму.

У будынку райвыканкама плануюць размясціць кніжную краму сеткі «Белкніга». Сёлета ўбачаць свет кніга-альбом Уладзіміра Ліхадзедава «Слонім. Падарожжа ў часе», зборнікі «Слонімшчына літаратурная» і «Слонімская зямля».

Замест пасляслоўя. Абмяркуем разам

Многія са слонімцаў лічаць, што грошы, выдзеленыя Слоніму на святкаванне Дня пісьменства, будуць патрачаныя на, безумоўна, важныя аб`екты. Аднак, акрамя свежапафарбаваных фасадаў будынкаў, новага асфальту на дарогах і саматугам расчышчанага рэчышча канала пасля свята нічога, бадай, не застанецца і нішто з гэтага не прыбавіць на Слонімшчыну турыстаў.

Некаторыя слонімцы прапануюць скарыстацца шанцам, які выпаў Слоніму з нагоды святкавання Дня пісьменства, і за выдзеленыя на гэта грошы пабудаваць у Слоніме нейкі грандыёзны аб`ект, які магнітам прыцягваў бы сюды турыстаў.

Напрыклад, на думку сланімчанкі Кацярыны Маркс, такімі аб`ектамі маглі б стаць: гадзіннік з дыяметрам цыферблату большым за 8 м (нават у Маскве гадзіннік быў бы меншым), штучны вадаспад на канале Агінскага метраў 20-30 вышынёй; закальцаваная веладарожка па маршруце Оперная вуліца — плошча Сапегі — Лабазоўскае возера — Жыровічы, якая перасякала б некалькі разоў Шчару па адмысловых мосціках; скульптура кнігі вышынёй звыш 20 м ці скульптура ляжачага на зямлі фаліянта прыкладна такіх жа памераў (гэта быў бы большы аб`ект, чым падобны ў Берліне); ліхтар вышынёй у 27 метраў (які дазволіў бы Слоніму трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса); бясплатная YouTube-студыя з вольным уваходам у любы час сутак, якую можна было б размясціць у пустуючым будынку; летняя водная горка для экстрэмальнага спуску, як у аквапарку, ад Беларусбанка да канала; статуя слана рэальнага памеру дзе-небудзь на беразе канал ці ў парку.

А што думаеце на гэты конт вы, нашы шаноўныя чытачы? Калі вы маеце што сказаць па гэтай тэме, калі ласка, патэлефануйце нам: 8 029 133-04-21. Абмяркуем разам!

Жанна ІВАНОВА

ФОТА З АРХІВА «ГС»
Работы па ачыстцы канала

ЦАНА СВЯТА

Сума неабходнага фінансавання, якую агучвалі ўлады напрыканцы 2018 года, складае 10 млн. 775 тыс. рублёў (5 млн. 799 тыс. руб. будзе выдзелена з абласнога бюджэту, 3 млн. 615 тыс. — з раённага бюджэту, 1 млн. 261 тыс. складуць сродкі прадпрыемстваў і 100 тысяч — спонсарскія сродкі). Два аб`екты — добраўпарадкаванне вуліцы Агінскага і прылеглай да канала тэрыторыі і гасцініца «Шчара» — увайшлі ў абласную інвестыцыйную праграму.

Выдаткі на добраўпарадкаванне і рамонт:

3,5 млн. руб. — вуліца Агінскага і прылеглыя тэрыторыі, пешаходны мост

1,8 млн. руб. — гасцініца «Шчара»

22 тыс. руб. — бібліятэка

23 тыс. руб. — будынак па вул. Чырвонаармейскай,

3 тыс. руб. — музей

100 тыс. руб. — помнік Сапегу

458 тыс. руб. — цэнтральныя вуліцы (Оперная, 1-я і 2-я Берагавая, Чапаева)

45 тыс. руб.— завулак Дружбы

2,365 млн. руб. — 10 жылых дамоў у цэнтры (па вул. Опернай, Берагавой)

30,2 тыс. руб. — дамы №5 і №14 па вул. Маладзёжнай у Жыровічах

90 тыс. руб. — ДЮСШ №2

50 тыс. руб. — СШ №5, ліцэй і цэнтр творчасці

139,1 тыс. руб. — рэдакцыя газеты «Слонімскі веснік»

659 тыс. руб. — 12 аб`ектаў Гроднаэнерга

547,4 тыс. руб. — 20 прамысловых будынкаў (+ начное падсвятленне)

47,5 тыс. руб. — 30 гандлёвых аб`ектаў

ПАЭЗІЯ

Пакуль жывуць на свеце нашы хаты...

Новыя вершы Сяргея Чыгрына

За Слонім і Айчыну

Я сеў з Агінскім выпіваць
Ў кафэ нямецкім і шыкоўным,
Праз вокны Шчара нам відаць,
І Шчары бачны нашы вокны.
Наш першы тост за Слонім быў,
Што гэты горад ёсць на свеце,
Бо тут Сапега слаўны жыў, —
Вазілі гетмана ў карэце.
Другі наш тост — за люд сланімскі,
За наш магутны родны люд.
Прапанаваў той тост Агінскі
Ў палацы слонімскім вось тут.
І мы пілі віно да дна,
І не сп'янелі б мы, магчыма...
Бо не хапала нам віна,
Калі пілі мы за Айчыну!

Сланімчанка

Далёкая і блізкая,
Адна, у белым плацці,
Імчыць ў палац Агінскага
На баль вялікі шчасця.
Прыгожая і зграбная,
Шчаслівая дзяўчына,
Ты скуль, скажы, такая:
З Жыровіч, з Альбярціна?
Страчаюць прыгажуню
І б`юць паклоны нізкія —
Зусім-зусім чужую
У Міхала Агінскага.
І гетман сустракае,
Аркестр іграе вальсы,
Віно цячэ ракою
І смажацца каўбасы...
І баль сядзібу музаў
Кружыў да самай раніцы,
Пілі там ўсе ад пуза,
Глядзелі на абранніцу.
Прыгожая такая —
Адна на горад Слонім,
Агінскага трымала
Нібыта у палоне.
З надзеяю і верай
Імпэт былі, натхненне...
Ад стомы слаўны гетман
Ёй цалаваў калені.

Вяснянкі

Вось і вясна выглядае
З чыстага берага Шчары,
Ну, прыплывай, дарагая, —
Высвеці нашы мары.

Высвеці нашу долю,
Лёс наш зрабі святлейшым.
Просіцца Шчара на волю —
Хоча быць Шчара першай.

Хвалі бягуць — не дагоніш,
Мусіць, вясну пачулі...
Будуць вяснянкі у Слоніме
Слонімцам шыць кашулі.

На пікнік у Слонім

Люты месяц задуменны,
Маразоў зноў не відаць.
Старадаўні, родны Слонім...
Хопіць, братка, сумаваць.
Ты не плач адлігай бруднай
У жыцці нашым штодзённым.
Мне з прыродай вельмі сумна,
Калі ты сумуеш, Слонім.
Адчуваю я палонным
Без Агінскага з Сапегам,
Запрашаю іх у Слонім,
На зімовую пацеху.
Каб не страцілася штосьці,
І каб сум маркотны знік...
Едуць гетманы у госці –
Будзе ў Слоніме пікнік.

Вецер у Слоніме

Вецер заблудзіўся ў Лабазоўцы,
І прылёг ля возера ў кусты.
А яго будзіла промнем сонца,
Нібы вецер — дзядзька халасты.
І злаваўся вецер, і смяяўся,
І жадаў на Брэсцкую ляцець.
І чужым машынам усміхаўся,
І стаміўся на людзей глядзець.
І прысеў на лаўку, і на сонцы
Назаўсёды трапіў у палон...
Бо хацеў пад`ехаць на «пяцёрцы»,
Ды «пяцёркі» сёння не было.

Не паміраўце, хлопцы і дзяўчаты, —
Я кожны дзень пра гэта гавару.
Пакуль жывуць на свеце нашы хаты,
Пакуль жыве на свеце Беларусь!

Я з вамі да бясконцасці багаты, —
Кашу і сею, сею і ару...
Не паміраўце, хлопцы і дзяўчаты,
Бо з вамі паміраe Беларусь!

Зіма

Зіма згубіла снег даўно
І знікла з Альбярціна,
Зіма з вясною п`е віно,
Зіма-дзяўчына.

Зіма паводкай паплыла
Па Шчары і па Ісе,
Зіма у Слоніме была, –
Мароз маліўся!

І падаў снег перад вясной,
І дым – у коміне...
Зіме-гаротніцы адной
Жыць сумна ў Слоніме.

Калючы дрот

Памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій

Ляжыць ён на звалцы, стары, паржавелы,
Нікому цяпер не патрэбны, гнілы.
А быў ён балючым, калючым і смелым —
Ахоўваў старых, маладых і малых.
І кожны глядзеў на яго, і свабоду
Ён бачыў за дротам ў сырых лагерах.
А потым выходзіў з калючага дроту
І ў сэрцы насіў ён і здзекі, і страх.
Выходзіў часова у шахты з тайгою,
З кіркою ў руках і з сякерай ў руках.
А дрот яму быў той папружкай тугою,
Якая сціскала жыццё на вачах.
А сёння ляжыць гэты дрот успамінаў,
Яго абыходзяць малы і стары...
За тых, хто загінуў і хто не загінуў —
Згніе на дварэ гэты дрот без пары.
Ляжыць ён на звалцы даўно паржавелы,
А памяць ніколі не будзе ржавець...
Народ мой пакутны, ды мужны і смелы,
Ён вечны, як неба, і сонца, і смерць.

Чаму няма у Слоніме трамваяў?
Тралейбусаў у Слоніме няма?..
Што возяць тых, каго мы не кахаем,
І тых, каго кахаем мы дарма.
І з рэек не сыходзяць тут трамваі,
Тралейбусаў не рвуцца правады...
А мы чужых, паверце, не кахаем,
Сваіх кахаць нам хопіць на гады.
Як за парэнчы нас жыццё трымае,
Каб з`ехалі з табой мы не туды.
Так хочацца у Слоніме трамваяў,
Што маюць мільянеры-гарады.
А можа мы не правільна кахаем,
І ў душах нашых — чэрствасці зіма?..
Таму няма у Слоніме трамваяў,
Тралейбусаў у Слоніме няма.

Адам і Марыля

Летам 1818 года Адам Міцкевіч прыехаў разам з Тамашом Занам у Туганавічы на Наваградчыну, дзе і распачалося ўзаемнае, няспраўджанае і няшчаснае каханне Адама да Марылі Верашчакі. Па легендзе, Адам Міцкевіч пасадзіў для Марылі бярозу. Людзі кажуць, што і ў сонечныя дні лісце бярозы былі вільготнымі ад тугі яе гаспадыні па каханым.

Пані Марыля, дзе ж твой Адаме?
Той, хто кахаў цябе светлым каханнем,
Той, хто пяяў табе там у растанні...
Пані Марыля, ну дзе твой Адаме?
Плача бяроза тваімі слязамі,
Бо у цябе не хапала больш слёз.
Пані Марыля, ну што ж ты сказала,
Чым ты не спраўдзіла светлы ваш лёс?
Ў сэрцы Адама — туга па адзінай
Самай прыгожай і самай каханай,
Больш не прыедзе паэт на Радзіму,
І не загоіцца ростанню рана.
Плача бяроза пад сонечным небам —
Нават бярозе тужліва адной.
Сёння Адаму нічога не трэба, —
Стала Марыля навекі чужой.
Дзе ж твой Адаме, пані Марыля?
Чаму прамяняў ён Літву на Парыж?..
Ты не адкажаш нам, пані Марыля,
А толькі заплачаш і прамаўчыш...

Дождж

Пагавары са мною, дождж,
Пра восень познюю і вецер,
Пагавары пра холад, ноч,
Пагавары пра ўсё на свеце...
Ды ты не ўмееш размаўляць,
А толькі плачаш безупынку...
Кахаць не ўмееш і чакаць,
Стаяць з букетам на прыпынку...
Ты сумны, дождж, ты – абібок,
Гультай сусветны і самотны...
Прыйшоў у горад к нам здалёк,
Як кавалер нібыта модны...
Ідзі адсюль адкуль прыйшоў,
З табой спаткацца не жадаем...
І дождж пачуў, і дождж пайшоў
Ад нас з самотай і адчаем.

СОВЕТУЮ ПОЧИТАТЬ

«ТЫ, ГЛАВНОЕ, ПИШИ О ЛЮБВИ»

Какие книги советуете почитать? — на этот вопрос отвечает педагог Слонимского районного центра детско-юношеского туризма Наталья Чертополохова:

— Советую почитать книгу Олега Куваева «Территория». Мне она очень близка, и даже не потому, что она про геологов, а потому, что она про настоящих людей, неравнодушных. Ещё мне очень нравятся книги Марины Москвиной. Как для человека творческого — её книга «Учись видеть» и «Ты, главное, пиши о любви». И все её книги о путешествиях. Как для человека пишущего — книга К. Паустовского «Золотая роза». У меня очень много любимых книг. И в каждый период жизни — разные. Но больше всего предпочитаю интеллектуальное чтение.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ВЫДАННІ

АЛЯКСЕЮ ЯКІМОВІЧУ ДАСЛАЛІ З ВЫДАВЕЦТВА ЯГО НОВУЮ КНІГУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ



Вокладка кнігі-брашуркі Аляксея Якімовіча

У снежні 2018 года часопіс «Пачатковае навучанне: сям`я, дзіцячы сад, школа» выдаў кнігу-брашурку пісьменніка са Слоніма «Учим алфавит» як дадатак да трох бліжэйшых нумароў часопіса.

У гэтым выданні юным чытачам прапануецца комплекс цікавых казак, вершаў, загадак, прыказак, прымавак, гульнявых практыкаванняў, падабраных аўтарам на кожную літару рускага алфавіта.

— Усе казкі ў гэтай кніжцы мае, аўтарскія. Гэтая кніжка дапаможа дзецям з цікавасцю вывучыць літары алфавіта, — адзначыў аўтар у размове з карэспандэнтам «ГС».

Мікола КАНАНОВІЧ

☺ ☺ ☺

К адвокату приходит человек, кладет ему на стол бумаги и говорит:
— Вот! Иванов против Петрова! Возьметесь?
Адвокат просматривает бумаги, встает, пожимает клиенту руку:
— Поздравляю вас, господин Иванов! На вашей стороне закон!
Тот возмущенно отдергивает руку:
— Я не Иванов! Я как раз Петров!
Но адвокат не отпускает его:
— Не волнуйтесь, господин Петров! На вашей стороне судебная практика!

☺ ☺ ☺

Однажды я подружился с камнем, а он упал в реку и утонул. Жаль, ведь я к нему привязался.

☺ ☺ ☺

Если у вас возник какой-то вопрос, выберите в толпе человека в наушниках, мы в них обычно слушаем справочную информацию.

☺ ☺ ☺

Некоторым людям хорошо не тогда, когда им хорошо, а когда их соседям плохо.

☺ ☺ ☺

После 6 вечера кушать не только вредно, но и очень хочется.

☺ ☺ ☺

В газете объявление:
— Пропал бультерьер, нашедшему царство небесное!

☺ ☺ ☺

Если нет царя в голове, то приходится ходить с его портретом.

ПРАГРАМА TV ад "Газеты Слонімскай"

4 — 10 марта

4 МАРТА ПОНЕДЕЛЬНИК

ИМЕНИНЫ В ЭТОТ ДЕНЬ
Архип, Евгений, Веденей, Филимон, Филон.
ПО КАТОЛИЧЕСКОМУ КАЛЕНДАРЮ
Казимир, Люция, Евгений.
ВОСХОД: *7.54* ЗАХОД: *18.50*
ДОЛГ. ДНЯ: *10.56*
Убывающая луна
Новолуние 6.03

Беларусь 1
06.00, 07.20, 08.15 Доброе утро, Беларусь!
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 00.20 Новости
07.05, 08.05 Новости экономики
07.10, 08.10, 18.15, 00.00 Зона Х
09.10 Главный эфир
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Счастливый билет
12.45, 13.05, 14.40, 15.25 Дом Надежды
15.15, 18.00 Новости региона
17.05 Белорусское времечко
21.00 Панорама
21.50 Наши
22.10 След
23.40 Арена
00.40 День спорта

ОНТ
06.00, 07.05, 08.05 Наше утро
07.00, 08.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Наши новости
09.10 Контуры
10.00 Жить здорово!
11.10 Детективы
11.50 Модный приговор
13.10 Аромат шиповника
15.00 Давай поженимся!
16.20 Мужское/Женское
17.25, 18.20 На самом деле
18.50 Удача в придачу!
18.55 Пусть говорят
20.00 Время
21.10 Ток-шоу «Наша жизнь»
22.10 Гадалка
23.10 Убойная сила
01.00 Наши новости. Главное за день

Беларусь 2
07.00 Включайся!
09.00, 18.35 Телебарометр
09.05, 20.05 Понять. Простить
10.05 Копейка в копейку
10.40 Мир наизнанку. Непал
11.35 М/с «Кунг-фу Панда: Захватывающие легенды»
12.45 Чип и Дейл спешат на помощь
13.35 В поисках Дори
15.05 Между небом и землей
16.40 Лара Крофт. Расхитительница гробниц 2. Колыбель жизни
19.15 Суперлото
21.05, 22.05 Папа попал
22.00 КЕНО
22.50 Иди сюда и танцуй
22.55 Тест на беременность
23.55 Сыграй меня, если сможешь

СТВ
05.30 Большой город
06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Новости «24 часа»
06.10, 20.15 Минщина
06.20, 07.45 Утро. Студия хорошего настроения
09.05 В последний момент
09.25 Неделя
10.40 Добро пожаловаться
11.10 БЕРЕГИСЬ АВТОМОБИЛЯ
12.50, 23.45 Самые шокирующие гипотезы
13.45, 00.25 Невероятно интересные истории
14.45 Водить по-русски
15.15, 16.50 Лучше не бывает
19.55, 22.55 СТВ-спорт
20.05 Столичные подробности
20.30 Меч 2
22.05 Смотреть всем!
23.00 Загадки человечества с Олегом Шишкиным
01.10 Минтранс
01.55 Самая полезная программа

Беларусь 3
07.00 Дабраранак
07.35 Беларуская кухня
08.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры
08.20, 12.15, 20.30 Гэты дзень
08.25 Нацыянальны хіт-парад
09.25, 16.30 Законны шлюб
10.55 Навукаманія
11.25, 21.05 Апошні дзень
12.25 Наперад у мінулае
12.50 Спявае Беларусь
13.45, 21.45 Маёр Ветраў
14.35, 22.35 Гісторыя міліцыі ў асобах
15.35 Люблю і памятаю
16.15 Архітэктура Беларусі
18.00 Анталогія «Славянскага базару»
18.55 Доказы з мінулага
19.35 Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака
20.00 АрціШок
20.40 Калыханка

Беларусь 5
07.00 Футбол. Чемпионат Англии. Тоттенхэм - Арсенал
08.55 Итоги недели
09.35 Теннис. WTA. Акапулько. Финал
11.40 Большой спорт
12.25, 14.15 Спорт микс
12.35 Баскетбол. Единая лига ВТБ. Калев (Таллин) - Цмокі-Мінск
14.25 Тренировочный день
14.55 Футбол. Чемпионат Англии. Эвертон - Ливерпуль
16.50 Хоккей. КХЛ. 1/4 финала. Восточная конференция. Четвертый матч.Трактор (Челябинск) - Автомобилист (Екатеринбург). Прямая трансляция. В перерывах: Спорт-микс, Спорт-центр
19.20 Хоккей. КХЛ. 1/4 финала. Западная конференция. Четвертый матч.Витязь (Московская обл.) - ЦСКА (Москва). Прямая трансляция. В перерывах: Спорт-микс, Спорт-центр
21.45 Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура
22.40 Смешанные единоборства. Международный турнир. Киев

РТР-Беларусь
07.00 Утро России
10.45 Плюс минус
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 ВЕСТИ
11.25 О самом главном
12.35, 14.30 Сладкое прощание Веры
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Новости - Беларусь
15.35 60 Минут
17.25 Судьба человека с Борисом Корчевниковым
18.35 Андрей Малахов. Прямой эфир
20.40 Акушерка. Новая жизнь
22.30, 23.10 Кто против?
00.30 Вечер с Владимиром Соловьевым

НТВ-Беларусь
05.55 Астропрогноз
06.00, 07.00, 08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 19.45 Сегодня
06.05 За гранью
06.25 Женщины и спорт
07.10 Поедем, поедим!
08.05 Мухтар. Новый след
10.20 Жди меня
11.10 Крутая история
11.55 Прокурорская проверка
13.30 Обзор
14.05, 16.30 Морские дьяволы
17.05 ДНК
18.05, 20.00 Невский. Чужой среди чужих
20.55 Пять минут тишины. Возвращение
22.45 ЧП.by
23.10 Чужое лицо

ТВ3
06.00 Мультфильм
07.25 Бальное платье
08.45 Доктор И...
09.20 10 самых
09.50 Смотри сам
10.10 Перископ
10.30, 03.25 Судебные страсти
12.15 Осторожно мошенники!
12.50 Без обмана
13.40 Спешите любить
15.30 Нераскрытые тайные
16.30 Мой герой
17.20 Прощание
18.10 Женщины Владимира Высоцкого
19.00, 01.50 Осколки
20.55 Орел и решка. По морям
22.00 Мир наизнанку
23.15 Сверхъестественное
00.00 Другая женщина
05.00 Временно доступен

ТНТ
06.00, 05.00 ТНТ
09.00, 10.15, 23.00, 00.00 Дом-2
11.30, 02.00 Бородина против Бузовой
12.30, 01.00 Спаси свою любовь
13.30 Песни
15.30, 16.00, 16.30, 17.00, 17.30 Универ
18.00, 19.00 Полицейский с Рублевки
20.00, 20.30 Год культуры
21.00 Где логика?
22.00 ОДНАЖДЫ В РОССИИ
03.00 Открытый микрофон

Киномикс
00.40 Скиф
02.35 Короли Догтауна
05.20 Самый опасный человек
07.40 Конченая
09.30 Похищенная
11.20 Третья персона
13.55 Страховщик
16.00 Малавита
18.00 Саботаж
20.00 Выжившая
22.00 Наемник

Дом Кино
06.00 Дурак
08.15 Криминальный талант
11.15 Змеелов
13.00 Белое солнце пустыни
14.40 «Операция «Ы»
16.25 Старик Хоттабыч
18.00 Сваты
22.50 Улицы разбитых фонарей
02.20 Без права на ошибку
03.45 Бумер. Фильм второй

МИР
06.00 Мой капитан
06.45, 10.10 Гардемарины, вперед!
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 00.00 Новости
13.15, 02.35 Зал суда. Битва за деньги
14.10, 00.55 Дела семейные. Битва за будущее
15.05, 01.45 Дела семейные. Новые истории
16.15, 00.10 Игра в кино
17.00, 18.00 Возвращение Мухтара - 2
19.25, 03.30 Пляж
21.20 Судебная колонка
05.05 Культ/туризм
05.30 Дурная кровь

ТВ 21
10.00, 18.00, 02.00 Путешествие из Парижа
11.25, 19.25, 03.25 Подлинный Вермеер
13.20 Преступление и наказание 3 с.
14.20, 22.20, 06.20 Мона Лиза
16.05, 00.05, 08.05 Водопад ангела
21.20 Преступление и наказание 3 с.
05.20 Преступление и наказание 3 с.

ТВ 1000
06.10, 17.30 Первый рыцарь
08.50 Рок Дог
10.50 Мой парень - псих
13.20 Доспехи бога: В поисках сокровищ
15.30 С вещами на вылет!
20.10 Малышка на миллион
22.45 Сфера
00.50 Немыслимое
02.40 Голос из камня
04.25 Моя большая греческая свадьба 2

ТВ 1000 Русское кино
06.20 Орда
08.50 СуперБобровы
10.45 Русалка
12.30 Подсадной
14.25 Гуляй, Вася
16.20, 17.10, 04.30, 05.15 Парфюмерша
18.05 Сумасшедшая помощь
20.20 Ирония любви
22.05 Мамы
00.10 О чём молчат девушки
01.55 Я любить тебя буду, можно?
03.10 Огни большой деревни

РЕТРоТВ
06.00, 22.25 Достояние Республики: Песни Леонида Дербенёва
07.45 Как мы весну делали
07.55 Как ослик счастье искал
08.10 Кентервильское привидение
08.30 Козел да баран
08.40 Козленок, который считал до десяти
08.50, 00.25 Блеф
10.30, 12.30, 18.15, 19.30 И это всё о нём
11.55 Желтый аист
12.05 Жихарка
12.20 Зелёный кузнечик
13.55, 02.25 Достояние Республики: Песни Иосифа Кобзона
16.10 Пикник у висячей скалы
20.45 Живая легенда
21.35 Дело темное
02.00 Имена-Легенды
04.25 Конек-Горбунок
05.40 Шайбу! Шайбу! СССР

ВТВ
06.05 РОГОВ. СТУДИЯ 24
07.00 НАШ РЕМОНТ
07.55 ЧИЧИЛЭНД
08.15 ТРИ КОТА
08.35 МАШКИНЫ СТРАШИЛКИ
09.00 ГАЛЕРЕЯ КРАСОТЫ
09.55 ПОСЛЕДНИЙ ИЗ МАГИКЯН
11.50, 03.10 РУБЛЁВО-БИРЮЛЁВО
12.50 ВОРОНИНЫ
14.45 ДРАКУЛА
17.15 УРАЛЬСКИЕ ПЕЛЬМЕНИ
18.40 СЧАСТЛИВЫ ВМЕСТЕ
20.00 ДЕВОЧКИ НЕ СДАЮТСЯ
21.00 ПЕКАРЬ И КРАСАВИЦА
22.00 АНГЕЛЫ ЧАРЛИ
23.55 ЛЮДИ ХЭ
00.55 ОДНА ЗА ВСЕХ
01.55 БЕЗМОЛВНЫЙ СВИДЕТЕЛЬ
04.00 ДУРАКИ И ДОРОГИ
05.00 ЛОВИ МОМЕНТ

5 МАРТА ВТОРНИК

ИМЕНИНЫ В ЭТОТ ДЕНЬ
Агафон, Лев, Нифонт, Корнилий.
ПО КАТОЛИЧЕСКОМУ КАЛЕНДАРЮ
Теофил, Фридерик, Адриан

ВОСХОД: *7.52* ЗАХОД: *18.52*
ДОЛГ. ДНЯ: *11.00*
Убывающая луна
Новолуние 6.03

Беларусь 1

06.00, 07.20, 08.15 Доброе утро, Беларусь!
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 00.25 Новости
07.05, 08.05 Новости экономики
07.10, 08.10, 18.15, 00.05 Зона Х
09.10, 22.10 След
10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Счастливый билет
13.05 Детский доктор
13.35 День в большом городе
14.35, 15.25 Любовь нежданная нагрянет
15.15, 18.00 Новости региона
17.05 Белорусское времечко
21.00 Панорама
21.50 Дело жизни. Возрождение
23.45 Сфера интересов
00.40 День спорта

ОНТ

06.00, 07.10, 08.10 Наше утро
07.00, 08.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Наши новости
07.05, 08.05 Тревожная кнопка
09.10 Жить здорово!
10.20 Детективы
11.10 Модный приговор
12.20 Гюльчатай
13.10 «Гюльчатай». Продолжение
14.40 Давай поженимся!
15.35, 16.20, 00.00 Мужское/Женское
16.55 На самом деле
18.20 «Удача в придачу!» с «Евроопт»
19.05 Пусть говорят
20.00 Время
21.10 Гадалка
22.10 Убойная сила
00.50 Наши новости. Главное за день

Беларусь 2

07.00 Включайся!
09.00, 17.35 Телебарометр
09.05, 20.15 Понять. Простить
09.40, 20.45 Семейные истории
10.15, 23.05 Экстрасенсы-детективы
11.10, 17.40 Следствие любви
12.50, 00.00 Тест на беременность
13.55 Муж напрокат
14.50 До свидания
15.40 Ничего себе ньюз
15.45 Пин_код
16.30 Орел и Решка. Кругосветка
19.20 Верю не верю
21.15, 22.05 Папа попал
22.00 Спортлото 6 из 49

СТВ

05.30 Центральный регион
06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Новости «24 часа»
06.10, 20.15 Минщина
06.20, 07.45 Утро. Студия хорошего настроения
